ISSN 1993-1999

БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

Янка Купала
1882–1942

Якуб Колас
1882–1956

11
2012

Махамед РОКАН

РАСКОПКІ ЦАРСКІХ ПАХАВАННЯЎ У ГОРАДЗЕ УР

У XX ст. падчас раскопак у горадзе Ур — адным з самых значных гарадоў старажытнасці — была знойдзена вялікая колькасць збудаванняў, а таксама шматлікія пахаванні жыхароў. Асаблівую цікавасць сярод іх уяўляюць тыя, дзе пахаваны цары разам з набліжанымі асобамі, слугамі і воінамі.

Горад Ур з'яўляецца адным з самых вядомых гарадоў старажытнасці. Яго рэшткі знаходзяцца на поўдні Ірака (365 км на паўднёвы ўсход ад Багдада). З даўніх часоў Ур адыгрываў значную ролю ў гісторыі шумерскай цывілізацыі. У Новашумерскі перыяд (2112—2004 гг. да н. э.) горад стаў сталіцай вялікай дзяржавы, якая ўключала значныя тэрыторыі Месапатаміі. У 2004 г. да н.э. гэта імперыя была знішчана эламітамі, што азначала завяршэнне шумерскай цывілізацыі.

На працягу многіх стагоддзяў горад быў пахаваны пад пяскамі і яго месцазнаходжанне было забыта. Вывіў Ур і правёў у ім першыя раскопкі ў 1852 г. Д.Г.Тэйлар, англійскі консул у горадзе Басра. Затым археалагічныя раскопкі спыніліся. Аднавіліся яны толькі пасля Першай сусветнай вайны[1].

У 1922—1934 гг. на працягу 12 сезонаў брытанскім археолагам Л.Вуллі былі адкрыты рэшткі архітэктуры горада, яго зікурата[2] і жылых кварталаў. У 1926—1932 гг. Л.Вуллі раскапаў і апісаў больш за дзве тысячы пахаванняў жыхароў горада. Большая частка іх адносіцца да Дынастычнага перыяду (прыкладна 2750 г. да н.э.), астатнія — да Акадскага перыяду (2337—2154 гг. да н.э.) і эпохі III дынастыі Ура (2112—2004 гг. да н.э.).

Спачатку Л.Вуллі раскапаў простыя магілы, у якіх нябожчык быў пахаваны альбо ў драўлянай труне, альбо загорнуты ў саван і пакладзены на зямлю[3]. У пахаваннях другой групы, якія аддзелены ад астатніх, нябожчыкі былі мужчынскага полу, рэчы побач з імі простымі — керамічны кубак, талерка ці іншы посуд. Таксама побач з целам заўсёды знаходзілася зброя — кінжал альбо бронзавае лязо кап'я. Л.Вуллі выказаў меркаванне, што гэта ваенная частка могілак. Каля кожнага цела знаходзілася таксама цыліндрычная пячатка невялікіх памераў (4 см у даўжыню, 3 см у дыяметры), зробленая з перламутру. На кожнай пячатцы адлюстраваны свой рысунак — паляўнічы-герой, паранены леў альбо казляня ці бык. Гэтыя выявы азначаюць перамогу. Па меркаванню Л.Вуллі, гэта былі знакі адрознення, атрыманыя воінамі за ўдзел у вайне[4].

Махамед Камiл РОКАН.
Загадчык кафедры археалогіі ўніверсітэта Аль Кадзісійя (Ірак), кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1976 г. у Багдадзе. У 2000 г. атрымаў ступень магістра па семіцкіх мовах і літаратуры, у 2011 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Планіровачная структура і архітэктура Ура ў III—II тыс. да н.э. па археалагічных данных". Аўтар кніг "Арамейская мова Старога Запавета: граматыка і тэксты" (Багдад, 2005), "Дзеяслоў у старажытна-яўрэйскай мове: па матэрыялах кнігі Быцця" (Багдад, 2010) і "Слоўнік арамейскіх слоў Старога Запавета" (Багдад, 2011).

Затым археолаг прадоўжыў глыбокія раскопкі ў раёне могілак і выявіў 16 наземных пахаванняў, што знаходзіліся на адным узроўні[5]. Л.Вуллі назваў іх "царскімі пахаваннямі", паколькі ў іх пахаваны цары, якія правілі ва Уры. Вывучаючы гэтыя пахаванні, вучоны выявіў незвычайную для месапатамскай цывілізацыі з'яву — чалавечыя ахвярапрынашэнні. Побач з цёламі цароў было пахавана мноства іншых цел — набліжаных асоб, слуг і воінаў. Большасць з іх складалі жанчыны.

Магіла пад нумарам 775 вылучалася асаблівым убраннем. У ёй знаходзілася цела цара Мескаламдука (Мес-Калам-Дука). Па традыцыі ён ляжаў на правым баку ў драўляным саркафагу, пастаўленым на зямлю. На галаве цара знаходзіўся залаты шлем, тулава было перавязана шырокім сярэбраным поясам, да якога быў прымацаваны залаты кінжал. З боку галавы знаходзіліся коп'і, наканечнікі якіх былі накіраваны ўніз у адным напрамку. Паміж імі былі знойдзены адзін медны і два залатыя кінжалы. Перад целам знаходзілася вялікая колькасць жэмчугу, золата і лазурыту, дзве залатыя талеркі і залатая лямпа з надпісам "Мес-Калам-Дук, герой прыемнай зямлі". Таксама была знойдзена вялікая сярэбраная лодка[6]. Варта адзначыць, што ў магіле няма слядоў чалавечых ахвярапрынашэнняў, у ёй знаходзілася толькі цела цара[7]. У магіле жа пад нумарам 1050 пахаваны цар Акаламдук (А-Калам-Дук), сын Мескаламдука. У ёй было знойдзена 40 цел, верагодна, членаў світы цара. Таксама тут знаходзіліся каштоўныя пахавальныя прыналежнасці, а таксама цыліндрычная пячатка з лазурыту з імем А-Калам-Дука і яго тытулам[8].

У магіле пад нумарам 1054 быў выяўлены попел, разбітыя керамічныя гаршкі і косткі розных жывёл. Перад дзвярыма склепа знаходзіліся шкілеты трох ягнят, унутры — пяць чалавечых шкілетаў. Чатыры з іх належалі мужчынам, верагодна, слугам (паколькі у іх не было каштоўных рэчаў), а пяты — жанчыне, царыцы альбо знатнай арыстакратцы. На яе чэрапе знаходзілася залатое пакрывала, а на грудзях — залатая шпілька, якая, верагодна, выкарыстоўвалася для сашчэплівання адзення. Побач з рукой знаходзіўся залаты кубак, аздоблены насечкамі[9]. Каля цела выявілі залатую цыліндрычную пячатку з імем цара Мескаламдука[10]. Магчыма, пахаваная жанчына была яго жонкай.

Магіла пад нумарам 789, дзе пахаваны цар Абаркі (А-Бар-Кі)[11], складаецца з двух сектараў. Першы ўяўляе сабой склеп са скляпеністай столлю ў паўночным куце. У гэтым памяшканні быў пахаваны цар. Тут таксама былі выяўлены раскіданыя рэшткі шкілетаў трох чалавек. Верагодна, у старажытныя часы магіла была разрабавана злодзеямі, якія спусціліся са столі. На целе цара нічога няма, практычна адсутнічае і пахавальны інвентар. Што тычыцца другога сектара, то гэта пляцоўка, якая знаходзілася звонку пахавальнага пакоя і злучалася з ёй праз уваход у заходнім куце. Па сутнасці, гэта вялізная яма, якая засыпана зямлёй[12]. У ёй было знойдзена каля

Уяўляемая карціна — світа, воіны і калёсы перад пахаваннем. Мастак А.Форэсцір. 1928 г.

60 цел, прычым большасць з іх — жаночыя. На іх галовах — вырабы з золата, сардаліку і лазурыту, на шыях — каштоўныя жамчужныя каралі. Перад целамі знаходзіліся рэшткі арфы, драўляныя часткі якой былі разбіты на дробныя кавалкі. Залатыя жа часткі да нас не дайшлі. Куфэрак музыканта быў аздоблены мазаікай. На яго пярэднім баку знаходзілася залатая галава быка з вачыма з лазурыту. На арфе — костка чалавечай рукі. Па ўсёй бачнасці, гэты чалавек граў на сваім інструменце ў момант раптоўнай смерці[13]. Нечаканасцю для Л.Вуллі стала знаходка абломкаў двух калёс, аздобленых керамікай. Іх цягнулі тры быкі, шкілеты якіх былі знойдзены перад кожнымі калёсамі. Быкоў у яму вялі шэсць пагаяных, шкілеты якіх таксама былі знойдзены[14]. У той час на знойдзеных калёсах у магілу было дастаўлена цела цара, пахавальныя прыналежнасці і багацці, складзеныя вакол яго.

Па суседству з магілай 789 знаходзілася падобная на яе магіла пад нумарам 800. Тут таксама быў склеп, у які можна было трапіць з вялізнай ямы, дзе знаходзіліся рэшткі чалавечых ахвяр. У гэтай магіле была пахавана царыца Пу-Алі (яе імя чыталася як Шубат)[15]. Каля яе цела быў знойдзены залаты кубак і лазурытавая цыліндрычная пячатка з яе імем[16]. Лічыцца, што Шубат была жонкай цара Абаркі, паколькі побач з яе целам была знойдзена цыліндрычная пячатка з імем названага ўладара[17]. Цела царыцы ляжала ў склепе на драўляным паланкіне, у руках быў залаты кубак. Верхняя частка шкілета была пакрыта вялізнай колькасцю залатых, сярэбраных і лазурытавых каралёў, а таксама каштоўнымі камянямі і сардалікам, нанізанымі на доўгія ніці, завязаныя на шыі, у выглядзе асаблівага адзення, што ішло да таліі і заканчвалася шырокім поясам з залатымі і лазурытавымі бусінкамі ў выглядзе трубачак. Былі выяўлены тры амулеты ў форме рыбы, два — з золата, адзін — з лазурыту. Усяго ў склепе знаходзіліся 267 пахавальных прыналежнасцей[18]. Акрамя цела царыцы былі тры шкілеты: два — каля паланкіна царыцы, а трэці — побач з ёй[19]. У знешнім памяшканні знойдзена 10 жаночых шкілетаў, якія пакладзены ў два шэрагі ўздоўж паўднёва-заходняга боку. У апошнім

шэрагу знаходзілася выкладзеная перламутрам арфа з упрыгажэннем у выглядзе галавы быка з золата і лазуриту. Рукі адной з жанчын ляжалі на арфе. У цэнтры памяшкання знаходзіліся рэшткі вялізнага куфара. Па ўсёй бачнасці, яго змесцiва было выкрадзена адразу пасля пахавання, а можа і незадоўга да яго. Побач з куфарам знаходзіліся рэшткі калёс, да якіх былі прывязаны два быкі. Іх шкілеты выяўлены там жа. З боку ад калёс у шэраг былі пакладзены шкілеты пяці воінаў. Усяго ў магіле пахаваны 25 членаў світы[20].

Л.Вуллі выявіў таксама царскае пахаванне, якое ўвасабляла "вялікую яму смерці". Гэта магіла пад нумарам 1237. Імя пахаванага ў ёй чалавека невядома. Тут знаходзілася самая вялікая колькасць ахвяр — 74 чалавекі, з іх 68 жанчын[21]. Яны былі пахаваны з усімі сваімі ўпрыгажэннямі з золата, серабра, каралямі з лазуриту і сердаліку. М.Э.Малаван, памочнік Л.Вуллі, пісаў, што гэтая яма нагадвала дыван залатога колеру, упрыгожаны пакрываламі, апранутымі на галовы арыстакратак царскага палаца. На дыване знаходзілася арфа, на якой у апошні момант смерці была сыграна пахавальная песня[22].

Засноўваючыся на выніках раскопак, Л.Вуллі лічыў, што шумерскія цары ў перыяд каля 2600 г. да н.э. практыкавалі ахвярапрынашэнні[23], каб забяспечыць сабе світу і слуг у іншым свеце. Ахвярам давалі спецыяльна прыгатаваную атруту, прычым адбывалася гэта ва ўрачыстай абстаноўцы пад акампанемент музыкі.

Муртакат лічыў, што гэты звычай бярэ свой пачатак у Дадынастычны перыяд і сягае каранямі ў абрад свяшчэннага, альбо боскага шлюбу, калі цар, правіцель альбо вярхоўны жрэц увасабляў бога плоднасці Дымузі, а царыца альбо вярхоўная жрыца — багіню Іштар. Гэты абрад здзяйсняўся з наступленнем кожнага новага года, каб гарантаваць урадлівасць і дабрабыт горада. Затым удзельнікі абраду, іх акружэнне і світа прымалі атруту і падчас рэлігійнага свята разам паміралі. Аднак Л.Вуллі быў рашуча не згодны з поглядамі Муртаката, паколькі для іх пацвярджэння трэба было выявіць мноства асобных пахаванняў, таму што свяшчэнны шлюб здзяйсняўся штогод[24].

Выяўленыя пахаванні дазволілі знайсці вялізныя багацці, супастаўныя толькі са спадчынай Старажытнага Егіпта — залаты і сярэбраны посуд, залатыя кінжалы, кларнеты, інкруставаныя каштоўнымі металамі і мазаікай, вялікую колькасць упрыгажэнняў з сердаліку і лазуриту, дошку для гульні ў нарды, маленькія статуі некаторых жывёл, кожная з якіх інкруставана золатам і каштоўнымі камянямі і г.д. Гэтыя вырабы сведчаць аб поспехах мастацтва і рамёстваў той эпохі і аб росквіце Шумерскай цывілізацыі.

Замалёўка пахаванняў у магіле пад нумарам 1237.

[1] Рокан М. Гісторыя археалагічных раскопак горада Ур // Беларускі гістарычны часопіс. 2009, № 8. С. 37—41.

[2] Рокан М. Архітэктура зікурата ў горадзе Ур // Беларускі гістарычны часопіс. 2010, № 5. С. 38—40.

[3] Нисан. Царское кладбище / Пер. Ф. Рашид // Шумер. 1966, № 22. С. 67—74.

[4] Аолиш Х. Шумерские люди ранней истории / Пер. Ниран Мохаммед Джасем. Багдад, 2005.

[5] Нисан. Царское кладбище. С. 68—69.

[6] Ханун Н. Гробницы и храмы в цивилизации Ирака. Т. 1. Дамаск, 2006. С. 234.

[7] Бакир Т. Введение в историю древних цивилизаций. Т. 1: Краткое введение в цивилизацию Месопотамии. Багдад, 1986.

[8] Ханун Н. Гробницы и храмы в цивилизации Ирака. С. 146.

[9] Woolley L. Ur of chaldees. NewYork, 1965. P. 35.

[10] Woolley L. The Royal Tombs of Ur // Antiquity Journal. 1928. Vol. II. P. 11.

[11] Ханун Н. Гробницы и храмы в цивилизации Ирака. С. 148.

[12] Аолиш Х. Шумерские люди ранней истории. С. 152—153.

[13] Ханун Н. Гробницы и храмы в цивилизации Ирака. С. 148—149.

[14] Там жа. С. 151.

[15] Бакир Т. Введение в историю древних цивилизаций. С. 281.

[16] Woolley L. The Royal Tombs of Ur. P. 11.

[17] Ханун Н. Гробницы и храмы в цивилизации Ирака. С. 151.

[18] Woolley L. The Sumerians. NewYork, 1965. P. 40.

[19] Ханун Н. Гробницы и храмы в цивилизации Ирака. С. 152.

[20] Там жа.

[21] Аолиш Х. Шумерские люди ранней истории. С. 152.

[22] Бакир Т. Введение в историю древних цивилизаций. С. 282.

[23] Аолиш Х. Шумерские люди ранней истории. С .153.

[24] Вулли Л. Месопотамия — колыбель цивилизации / Пер. А.Абдульбакий. Багдад, 1947.